**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»
________________І.В. Семчанка
(подпіс)
____________________
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-_________/р.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Вучэбная праграма па дысцыпліне для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення ўсіх спецыяльнасцей, якія вывучаюць беларускую мову

Факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і навучання замежных студэнтаў

Кафедра давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі

Курс падрыхтоўчае аддзяленне

Семестр 1-2

Лекцыі – 32 гадзіны

Экзамен –

Практычныя заняткі 60 гадзін

Залік 1,2 семестры

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне 92 гадзіны

Курсавы праект (работа) –

Усяго гадзін па дысцыпліне 92 гадзіны

Форма атрымання адукацыі вочна-завочная

Складальнік: С.В. Чайкова, дацэнт

2010

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Вучэбная праграма складзена на аснове Праграмы ўступных іспытаў для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы, зацверджанай Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.12.2009 № 1193

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці рабочага варыянта на пасяджэнні кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі

___ _____2010 г., пратакол № ____

Загадчык кафедры
дацэнт _______В.І. Яцухна

Адобрана і рекамендавана да зацвярджэння Метадычным саветам факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і навучання замежных студэнтаў

___ _____2010 г., пратакол № ____

Старшыня, дэкан факультэта
дацэнт ________А.Ф. Васільеў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская мова з'яўляецца нацыянальнай мовай беларускага народа. Яна адна з дзвюх дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь.

Абітурыентам, якія зарыентаваны на паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы нашай краіны, прадстаўляецца права выбару мовы (беларускай або рускай) пры здачы уступных іспытаў у выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання.

Мэта выкладання дысцыпліны "Беларуская мова" ў сістэме давузаўскай падрыхтоўкі – падрыхтоўка абітурыентаў да паспяховага выканання тэставых заданняў цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове, а таксама павышэнне ўзроўню іх моўнай культуры як састаўной часткі агульнай культуры чалавека. Выкладанне курса базуецца на паглыбленым вывучэнні пытанняў, прадугледжаных праграмай школьнага курса беларускай мовы .

Дадзеная вучэбная праграма па дысцыпліне "Беларуская мова" падрыхтавана для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення ўсіх спецыяльнасцей вочна-завочнай формы навучання і распрацавана ў адпаведнасці з Праграмай уступных іспытаў для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы, зацверджанай Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.12.2009 №1193.

Мэта праграмы – дапамагчы слухачам падрыхтоўчага аддзялення паўтарыць, абагуліць і сістэматызаваць:
– веды аб сістэме мовы па ўсіх яе раздзелах;
–правілы функцыянавання моўных сродкаў;
– нормы сучаснай беларускай мовы (фанетычныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, словаўтваральныя, лексічныя, фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя);
– тэорыю мовы (паняцце пра віды, формы, тыпы, жанры маўлення, тэкст, функцыянальныя стылі і г.д.).
–культуру вуснага і пісьмовага маўлення, правілы маўленчых зносін.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Беларуская мова" слухачы павінны:
– ***ведаць***:
– паняцці "мова", "маўленне", "тэкст", "тэма тэкста", "падтэмы тэкта", "тэматычнае адзінства", "віды сувязі", "сродкі сувязі", "формы маўлення", "тыпы маўлення", "апісанне", "апавяданне", "разважанне";
–функцыянальныя стылі беларускай мовы;
– фанетычную сістэму беларускай мовы;
– арфаэпічныя і акцэнталагічныя нормы беларускай мовы і адрозненне іх ад рускай мовы;
– прынцыпы беларускага арфаграфіі; правілы напісання галосных, зычных, мяккага знака і апострафа;
– лексічную сістэму беларускай мовы;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

–віды пераносу слоў: метафару, метанімію, сінекдаху;
–разрады лексікі паводле паходжання, актыўнага і пасіўнага складу, стылістычнай дыферынцыяцыі, сферы ўжывання;
–значэнне фразеалагізмаў;
–граматычныя катэгорыі і разрады іменных часцін мовы: назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, іх скланенне і правапіс;
– граматычныя катэгорыі дзеяслова і яго формаў: дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя;
–разрады і ступені прараўнання прыслоўяў;
–асаблівасці ўжывання слоў з прыназоўнікамі ў беларускай мове (у адрозненне ад рускай);
–стылістычнае выкарыстанне часціц;
–разрады злучнікаў;
–выклічнік як асобую часціну мовы;
– сінтаксіс простага сказа (тыпы дзейніка і выказніка, дапаўнення, азначэння, акалічнасць);
– сінтаксіс складанага сказа (складаназлучаныя, складазалежныя, бяззлучнікавыя, сказы з рознымі відамі сувязі, іх адзнакі, віды) ;
–пунктуацыю простага сказа;
–пунктуацыю складанага сказа.
–спосабы перадачы чужой мовы (простая, ускосная, няўласна-простая, цытата, дыялог).

***умець***:
–вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, выдзяляць часткі тэксту, яго падтэмы, вызначаць від і сродкі сувязі паміж сказамі, часткамі тэксту;
– вызначаць стыль і тып маўлення;
– аналізаваць тэкст з улікам стылявой характарыстыкі;
– выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стылей;
–ацэньваць мэтазгоднасць выбару моўных сродкаў, з дапамогай якіх раскрываецца тэма тэкста;
– рабіць агульны стылістычны аналіз тэксту;
–знаходзіць і выпраўляць маўленчыя памылкі ў тэксце;
–выбіраць патрэбныя моўныя сродкі для перадачы зместу выказвання;
– выкарыстоўваць адпаведныя моўныя сродкі ў тэкстах розных стылей і тыпаў для стварэння дарэчнага, дакладнага, выразнага, разнастайнага маўлення;
– размяжоўваць гукі і літары; выдзяляць галосныя і зычныя гукі, вызначаць звонкія, глухія, санорныя, мяккія, цвёрдыя і зацвярдзелыя гукі, даваць ім характарыстыку;
– выдзяляць націскныя і ненаціскныя склады, характарызаваць націск.
– бачыць арфаграму і яе вызначальныя прыметы;
–знаходзіць і выпраўляць арфаграфічныя памылкі ў словах;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

–дакладна ўжываць словы, размяжоўваць мнагазначныя словы і амонімы, паронімы, утвараць сінанімічны рад, вызначаць антанімічныя адносіны паміж словамі;
–дакладна ўжываць фразеалагізмы;
–размяжоўваць аднакаранёвыя словы і формы аднаго слова, марфемы; выдзяляць аснову і афіксы;
–вызначаць спосаб утварэння слова;
–вызначаць назоўнікі, прыметнікі, займеннікі, лічэбнікі на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных асаблівасцей, класіфікаваць іх на разрады;
– вызначаць дзеяслоў і яго формы: дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе, утвараць патрэбныя формы; размяжоўваць правільнае і няправільнае ўжыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў;
–адрозніваць прыслоўі ад іншых часцін мовы; утвараць простую і складаную форму вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыслоўяў;
–адрозніваць службовыя часціны мовы: прыназоўнікі, злучнікі, часціцы ад іншых часцін мовы;
–знаходзіць выклічнікі ў тэксце і аддзяляць ці выдзяляць іх знакамі прыпынку;
–знаходзіць і выпраўляць марфалагічныя памылкі ў сказах;
–вычляняць словазлучэнні са сказа, вызначаць іх тып і від падапарадкавальнай сувязі паміж словамі;
–размяжоўваць сказы па структуры, наяўнасці галоўных і даданых членаў, інтанацыі;
–вызначаць канструкцыі, якія робяць сказ ускладненым;
–правільна ставіць знакі прыпынку з улікам пэўнай пунктаграмы ў простым сказе;
–вызначаць тып складанага сказа; колькасць частак, адносіны і від сувязі паміж імі;
– вызначаць від даданай часткі і спосаб падпарадкавання ў складаназалежным сказе з некалькімі даданымі часткамі;
– правільна ставіць знакі прыпынку з улікам адносін паміж часткамі ў складаным сказе;
–вызначаць спосаб перадачы чужой мовы; складаць сказы з простай і ўскоснай мовай, замяняць простую мову ускоснай.
–знаходзіць і выпраўляць сінтаксічныя памылкі ў сказе ці тэксце.

На вывучэнне дадзенай дысцыпліны прадугледжана 92 гадзіны, у тым ліку лекцый – 32 гадзіны, практычных заняткаў – 60 гадзін.

На практычных занятках плануецца праверка практычнай пісьменнасці (граматнасці), ведання ўсіх раздзелаў беларускага мовазнаўства, культуры маўлення, моўнай кампетэнцыі, Набытыя веды будуць правярацца як тэарэтычна, так і практычна (індывідуальныя адказы, дыктанты, выкананне тэматычных і камбінаваных тэстаў, самастойныя і кантрольныя работы ).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Курс “Беларуская мова” складаецца з 6 раздзелаў, кожны з якіх завяршаецца выкананнем кантрольнай работы.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### РАЗДЗЕЛ 1 Маўленне

Тэма 1.2 Маўленне: адзінкі, віды, формы, тыпы

Паняцці “мова” і “маўленне”.

Тэкст як адзінка сінтаксісу і звязнага маўлення. Асноўныя прыметы тэксту: тэматычнае адзінства, цэласнасць, звязнасць, завершанасць. Тэма і ідэя тэксту.

Віды маўлення: унутранае і вонкавае (знешняе). Формы маўлення: вуснае і пісьмовае.

Тыпы маўлення: апісанне, апавяданне, разважанне і іх тыповыя кампазіцыйныя схемы.

Тэма 2 Функцыянальныя стылі

Паняцце функцыянальнага стылю. Асноўныя стылі сучаснай беларускай мовы. Размоўны, навуковы, афіцыйна-дзелавы, публіцыстычны стылі, стыль мастацкай літаратуры. Сфера выкарыстання функцыянальных стыляў. Мэты і задачы выказвання. Асноўныя стылявыя рысы. Характэрныя моўныя сродкі. Асноўныя жанры.

### РАЗДЗЕЛ 2 Лексіка і фразеалогія

Тэма 2.1 Лексіка

Слова, яго лексічнае значэнне.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слоў.

Амонімы, іх адрозненне ад мнагазначных слоў.

Сінонімы і антонімы, іх роля ў маўленні.

Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку.Стылістычны падзел лексікі. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Лексіка беларускай мовы паводле актыўнага і пасіўнага складу

Тэма 2.2 Фразеалогія і лексікаграфія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Фразеалагізм як адзінка мовы, іх роля ў маўленні. Фразеалогія ў шырокім плане: прыказкі, прымаўкі, крылатыя выразы, перыфразы. Крыніцы і адметнасць беларускай фразеалогіі.

Лексікаграфія як радзел мовазнаўства. Слоўнікі беларускай мовы.

## РАЗДЗЕЛ 3 Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія

Тэма 3.1 Фанетыка і арфаэпія.

Гукі беларускай мовы. Нормы беларускаага літаратурнага вымаўлення (вымаўленне галосных, зычных і спалучэнняў зычных).

Склад і націск. Роля націску пры адрозненні слоў і некаторых формаў слоў.

Вымаўленне і правапіс галосных пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных.

Тэма 3.2 Графіка і арфаграфія

Беларускі алфавіт. Назвы літар. Суаадноснасць гукаў і літар. Прызначэнне і гукавое значэнне літар ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***.

Правапіс галосных ***о, э, а; е***, ***ё***, ***я***, ***і*** (у тым ліку ў складаных, складанаскарочаных, запазычаных словах і ва ўласных назвах).

Прынцыпы беларускай арфаграфіі.

Тэма 3.3 Правапіс галосных і зычных

Правапіс спалучэнняў ***іо***, ***іа***, ***іё (ыё)***, ***ія (ыя)***, ***іе (ые)*** у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя, глухія і звонкія, свісцячыя і шыпячыя. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных.

Правапіс зычных ***д — дз, т — ц***.

Прыстаўныя зычныя і галосныя.Правапіс прыстаўных зычных і галосных.

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Правапіс ***у — ў***.

Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме. Правапіс мяккага знака. Правапіс апострафа і раздзяляльнага мяккага знака

## РАЗДЗЕЛ 4 Марфемная будова слова, словаўтварэнне і арфаграфія

Тэма 4.1 Марфемная будова слова

Марфемы як структурна значымыя часткі слова. Аснова слова. Вытворныя і невытворныя асновы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Канчатак, нулявы канчатак.
Корань. Аднакаранёвыя (роднасныя) словы і формы аднаго і таго ж слова.
Чаргаване галосных і зычных у аснове слова.
Прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс (злучальная галосная).
Правапіс прыставак.Правапіс ***ы, і, й*** пасля прыставак.
Прызначэнне марфем (словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы).

Тэма 4.2 Словаўтварэнне

Утваральная аснова. Марфемныя спосабы ўтварэння слоў.
Складанне як спосаб утварэння слоў.
Марфемныя спосабы ўтварэння слоў

Тэма 4.3 Правапіс

Правапіс прыставак. Правапіс ***ы, і, й*** пасля прыставак.
Правапіс складаных і складанаскарочаных слоў. Правапіс галосных у складаных словах.

**РАЗДЗЕЛ 5 Марфалогія і арфаграфія**

Тэма 5.1 Іменныя часціны мовы

Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў.Самастойныя і службовыя часціны мовы. Пераход слоў адных часцін мовы ў іншыя.
Назоўнік як часціна мовы. Агульныя і ўласныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, зборныя, рэчыўныя, канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі.
Род, лік назоўнікаў, склон назоўнікаў. Утварэнне і правапіс назоўнікаў.
Прыметнік як часціна мовы, Якасныя, адносныя, прыналежныя прыметнікі, і ўтварэнне і правапіс.
Лічэбнік як часціна мовы. Падзел лічэбнікаў паводле структуры, значэння і граматычных прымет. Скланенне і правапіс лічэбнікаў.
Займеннік як часціна мовы. Разрады займеннікаў паводле значэння. Скланенне і правапіс займеннікаў.

Тэма 5.2 Дзеяслоў і яго формы

Дзеяслоў як часціна мовы. Граматычныя катэгорыі дзеяслова. Спражэнне і правапіс дзеясловаў.
Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова. Утварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў.
Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова. Утварэнне і правапіс дзеепрыслоўяў.

Тэма 5.3 Прыслоўе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў па значэнні. Утварэнне прыслоўяў.Ступені параўнання прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў. Правапіс ***не(ня)***, ***ні*** з прыслоўямі.

Тэма 5.4 Службовыя часціны мовы і выклічнік

Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Некаторыя асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

Злучнік як службовая часціна мовы. Разрады злучнікаў

Часціца як службовая часціна мовы. Разрады часціц. Правапіс часціц.

Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс

Выклічнік як асобая часціна мовы. Правапіс выклічнікаў.

**РАЗДЗЕЛ 6 Сінтаксіс і пунктуацыя**

Тэма 6.1 Сінтаксіс і пунктуацыя простага сказа

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні і сродкі яе выражэння.

Асаблівасці дзеяслоўнага кіраванння ў беларускай мове.

Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка.

Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі. Знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Просты сказ. Парадак слоў у сказе. Лагічны націск у сказе.

Галоўныя і даданыя члены сказы.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, у няпоўным сказе, сэнсавы. Інтанацыйны. Сказы з аднароднымі, адасобленымі членамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальным зваротам, звароткам і знакі прыпынку ў іх.

Тэма 6.2 Складаназлучаныя і бяззлучнікавыя сказы

Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сэнсава-граматычныя адносіны паміж чаткамі бяззлучнікавага сказа. Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Тэма 6. 3 Складаназалежныя і складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.

Складаназалежныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы як сродкі сувязі частак складаназалежнага сказа. Тыпы даданых частак. Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем. Знакі прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

Тэма 6.4 Чужая мова

Простая і ўскосная мова як спосаб перадачы чужога маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Ускосная мова. Правілы замены простай мовы ўскоснай.

Дыялог. Знакі прыпынку пры дыялогу.

Цытаты. Правілы афармлення цытат на пісьме.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

*Прыкладныя тэмы практычных заняткаў*

1 Маўленне: адзінкі, віды, формы, тыпы
2 Фунцыянальныя стылі
3 Лексіка
4 Класіфікацыя лексікі
5 Фразеалогія і лексікаграфія
6 Фанетыка і арфаэпія
7 Графіка і арфаграфія
8 Правапіс галосных
9 Правапіс зычных
10 Правапіс мяккага знака і апострафа
11 Марфемная будова слова
12 Словаўтварэнне
13 Правапіс
14 Часціны мовы
15 Назоўнік
16 Прыметнік
17 Лічэбнік і займеннік
18 Дзеяслоў
19 Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова
20 Прыслоўе
21 Службовыя часціны мовы і выклічнік
22 Сінтаксіс: словазлучэнне
23 Сінтаксіс і пунктуацыя простага сказа
24 Аднародныя і адасобленыя члены
25 Параўнальны зварот, зваротак, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі
26 Складаназлучаныя сказы
27 Складаныя бяззлучнікавыя сказ
28 Складаназалежныя сказы
29 Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі
30 Спосабы перадачы чужога маўлення

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

*Рэкамендуемыя формы кантроля*

1 Кантрольныя работы

*Рэкамендуемыя тэмы кантрольных работ*

1 Кантрольная работа №1 “Стылістыка. Лексіка і фразеалогія”
2 Кантрольная работа №2 “Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”
3 Кантрольная работа №3 “Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія”
4 Кантрольная работа №4 “Марфалогія і арфаграфія”
5 Кантрольная работа №5“Сінтаксіс і пунктуацыя простага сказа”
6 Кантрольная работа №6 “Сінтаксіс і пунктуацыя складанага сказа”

*Рэкамендуемыя пытанні да заліку*

1 Тэкст як адзінка звязнага маўлення, і яго асноўныя прыметы
2 Тыпы маўлення, тыповыя кампазіцыйныя схемы
3 Функцыянальныя стылі
4 Адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнні слоў.
5 Амонімы, сінонімы, антонімы, паронімы
6 Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку
7 Стылістычны падзел лексікі
8 Лексіка беларускай мовы паводле паходжання
9 Лексіка беларускай мовы паводле актыўнага і пасіўнага складу
10 Фразеалогія беларускай мовы
11 Гукі беларускай мовы.
12 Вымаўленне галосных, зычных гукаў і спалучэнняў зычных гукаў
13 Склад і націск
14 Прызначэнне і гукавое абазначэнне літар е, ё, ю, я, і
15 Прынцыпы беларускай арфаграфіі
16 Правапіс галосных о,э, а; е, ё, я

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

17 Правапіс спалучэнняў іо, іа, іё (ыё), ія (ыя), іе (ые) у запазычаных словах
18 Правапіс у – ў
19 Правапіс прыстаўных галосных і зычных
20 Правапіс мяккіх, цвёрдых і зацвярдзелых, глухіх і звонкіх, свісцячых і шыпячых зычных
21 Правапіс спалучэнняў зычных
22 Правапіс зычных д – дз, т – ц
23 Правапіс падоўжаных зычных
24 Правапіс змякчальнага мяккага знака, раздзяляльнага мяккага знака і апострафа
25 Аснова слова, вытворныя і невытворныя асновы
26 Корань слова, аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова
27 Прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс, канчатак (нулявы канчатак)
28 Марфемныя спосабы ўтварэння слоў
29 Складанне як спосаб утварэння слоў
30 Немарфемныя спосабы ўтварэння слоў
31 Правапіс прыставак і літар і, ы, й пасля іх
32 Правапіс складаных і складанаскарочаных слоў
33 Правапіс галосных у складаных словах
34 Самастойныя і службовыя часціны мовы
35 Назоўнік як часціна мовы
36 Прыметнік як часціна мовы
37 Лічэбнік як часціна мовы
38 Займеннік як часціна мовы
39 Дзеяслоў як часціна мовы
40 Дзеепрыметнік як форма дзеяслова
41 Дзеепрыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля
42 Прыслоўе як часціна мовы, разрады
43 Службовыя часціны мовы і выклічнік
44 Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні
45 Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі
46 Галоўныя і даданыя члены сказа
47 Працяжнік: паміж дзейнікам і выказнікам, у няпоўным сказе, сэнсавы, інтанацыйны
48 Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа
49 Адасабленне азначэнняў і прыдаткаў.
50 Адасабленне акалічнасцей
51 Адасабленне дапаўненняў і ўдакладняльных членаў
52 Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі і зваротκам
53 Пунктуацыя ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.
54 Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова
55 Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

56 Бяззлучнікавыя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова
57 Знакі прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах
58 Складаназалежныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова
59 Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі
60 Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах
61 Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, іх сінтаксічныя прыметы, будова
62 Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак
63 Простая мова як спосаб перадачы чужога маўлення і знакі прыпынку пры ёй
64 Дыялог і знакі прыпынку пры ім
65 Цытаты і правілы афармлення іх на пісьме

*Рэкамендуемая літаратура*

**Асноўная**

1 Бадзевіч, Э. І. 50 асноўных правілаў беларускай пунктуацыі : дапаможнік для вучняў старэйшых класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў, гімназій / Э. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск, 2000.

2 Беларуская мова : дапаможнік для абітурыентаў / Э. Д. Блінава, Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва [і інш.] – Мінск, 1992.

3 Беларуская мова: сцісла і даступна : дапаможнік для старшакласнікаў і абітурыентаў / пад рэд. Ул. Г. Будай. – Мінск, 2000.

4 Беларуская мова : у 2 ч. / пад рэд. Л.М. Грыгор’евай. – Мінск, 1998.

5 Блінава, Э.Д., Беларуская мова : практычны дапаможнік для абітурыентаў / Э.Д. Блінава, Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва і інш., – Мінск, 1994.

6 Камароўскі, Я.М., Беларуская мова : дапаможнік для абітурыентаў / Я.М.Камароўскі, Е.С. Мяцельская. – Мінск, 1993.

7 Малажай, Г.М. Дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання / Г.М. Малажай. – Мінск, 2004.

8 Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск, 2008.

9 Роўда, І.С. Экзамен па беларускай мове / І.С.Роўда, В.П. Красней, І.Р. Шкраба. – Мінск, 2001.

10 Цыбульская, С.І. Беларуская мова : інтэнсіўны курс падрыхтоўкі да тэсціравання і экзамену / С.І. Цыбульская. – Мінск, 2004.

**Дадатковая**

11 Беларуская мова : дапаможнік для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і ўступных экзаменаў / склад. Л.А. Гіруцкая. – Мінск, 2004.

12 Беларуская мова : дапаможнік для падрыхтоўкі: цэнтралізаванае тэсціраванне, адзіны экзамен / аўт.-склад. Л. А. Гіруцкая. – Мінск, 2004.

13 Беларуская мова ў практыкаваннях і тэстах : дапаможнік для падрыхтоўкі да экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання. – Мінск, 2007.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

14 Беларуская мова ў табліцах і схемах: вучэб. дапам. для вучняў ст. кл. сярэд. шк./ Г.М. Валочка, Я.М. Лаўрэль, В.П. Красней і інш. – Мінск, 1998.

15 Беларуская мова ў табліцах і схемах: вучэб. дапам. для вучняў ст. кл. сярэд. шк./ Г.М. Валочка, Я.М. Лаўрэль, В.П. Красней і інш. – Мінск, 1998.

16 Беларуская мова : рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання : аналіз памылак, каментарый да адказаў, трэніровачныя тэсты. – Мінск, 2007.

17 Здаём экзамен па беларускай мове : экзаменацыйныя і даведачныя матэрыялы / В.П. Красней, І.С. Роўда, У.Р. Шкраба. – Мінск, 1994.

18 Капылоў, І.Л. Беларуская мова ў табліцах і схемах : дапаможнік для школьнікаў і абітурыентаў / І.Л. Капылоў, С.Я. Рапацэвіч. – 2-е выд. – Мінск, 2004.

19 Красней, В.П. Беларуская мова ў табліцах і схемах : для школьнікаў / В.П.Красней. – Мінск, 2007.

20 Куліковіч, У.І.Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні, Тэсты. Слоўнік : вучэбны дапаможнік / У.І. Куліковіч. – Мінск, 2009.

21 Смольская, Т.М. Беларуская мова ў экзаменацыйных тэстах / Т.М. Смольская. – Мінск, 2004.

22 Старычонак, В.Д.Беларуская мова : Узоры моўнага аналізу. Трэніровачныя заданні. Тэсты : у дапамогу абітурыентам і школьнікам / В. Д. Старычонак. – Мінск, 2002.

23 Цыбульская, С.І. Рыхтуемся да пераказу па беларускай мове : дапаможнік для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / С.І. Цыбульская, А.М. Копач. – Мінск, 2002.

24 Лепешаў, І.Я. Практыкум па беларускай мове : дапаможнік па беларускай мове / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панючыц. – Мінск, 2001.

25 Практыкум па беларускай мове : вучэбны дапаможнік для нефілалагічных факультэтаў ВНУ / пад рэд. Г.М. Малажай. – Мінск, 1993.

**Зборнікі тэстаў**

26 Тэставыя заданні па беларускай мове для вучняў старэйшых класаў і абітурыентаў / І.У. Рэпенка. – Мінск, 1998.

27 Тэсты: Беларуская мова : матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / УА Рэсп.ін-т кантролю ведаў. – Мазыр, 2003.

28 Тэсты: Беларуская мова : матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання /УА Рэсп.ін-т кантролю ведаў. – Мазыр, 2004.

29 Малажай, Г.М. Цэнтралізаванае тэсціраванне : Беларуская мова : Тэсты (прыкладныя варыянты) з адказамі / Г.М. Малажай. – Мінск, 2004.

30 Беларуская мова: дапам. Для падрыхт. да цэнтраліз. тэставання/ Рэсп.ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь; пад рэд. В.М. Лапанік, Н.В. самедавай. – Мінск, Мазыр, 2005.

31 Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск., 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

32 Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск., 2006.
33 Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск., 2007.
34 Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск., 2008.
35 Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск., 2009.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ